# 17-га САКАВІКА — УСЕСАЮЗНЫ РЭФЕРЭНДУМ. АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА АБНОЎЛЕНЫ САЮЗ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК!


# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 8 (795) | Аўторак, 12 сакавіка 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


## ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў АНГЛІІ

**Усё часцейшымі становяцца зарубежныя камандзіроўкі для** вучоных нашага універсітэта. У прыватнасці, цяпер яго рэктар член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Л. А. Шамяткоў і загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка знаходзяцца ў Англіі. Леанід Аляксандравіч выступае з лекцыямі і навуковымі дакладамі перад англійскімі студэнтамі і матэматыкамі, расказвае аб дасягненнях гомельскай алгебраічнай школы.

Шмат цікавых сустрэч адбудзецца і ва Уладзіміра Васільевіча. Дарэчы, на брытанскія астравы ён запрошаны ў другі раз.

У высокаразвітай краіне Л. А. Шамяткоў і У. В. Анічэнка прабудуць увесь сакавік. За гэты месяц у іх з'явіцца шмат уражанняў, якімі яны падзеляцца пасля вяртання на радзіму з чытачамі нашай газеты.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ — ЛЕПШЫМ

На падставе рашэння Вучонага савета ад 28 лютага 1991 г. за выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць назначаны імянныя стыпендыі на другі семестр бягучага навучальнага года:

**Імя ЛЕНІНА:**

Аксане ЧАРНЯЎСКАЙ — студэнтцы V курса фізічнага факультэта (з 2 снежня 1990 г.);

Аляксандру ФІЛІПЦОВУ — студэнту III курса, Рыгору КОЖАНУ, Вользе СУКАЛІНАЙ, Ліліі ТКАЧОВАЙ — студэнтам IV курса (усе — матэматычны факультэт, з 1 лютага);

Трэцякурснікам Уладзіміру АРХІПЕНКУ з фізічнага і Таццяне ЧЫНДАРАВАЙ з эканамічнага факультэтаў (з 1 лютага).

**Імя Я. КУПАЛЫ:**

Ліліі ШПАКОЎСКАЙ — студэнтцы IV курса філалагічнага факультэта (з 1 лютага).

**Імя Ф. СКАРЫНЫ:**

Алене ЦЕРБАВАЙ — студэнтцы III курса філалагічнага факультэта (з 17 лютага).

**Вучонага савета:**

Васілю САФОНАВУ — студэнту V курса матэматычнага факультэта (з 23 снежня 1990 г.);

Мікалаю БРУЕВІЧУ — студэнту III курса гістарычнага факультэта (з 26 студзеня);

Сяргею КАВАЛЕНКУ — студэнту V курса геалагічнага факультэта (з 24 лютага).

**Горача віншуем імянных стыпендыятаў, жадаем ім новых поспехаў у авалодванні выбранымі прафесіямі, плённай навукова-даследчай працы і актыўнай дзейнасці ў грамадскім жыцці.**

Адначасова нагадаем: адна стыпендыя — імя Я. Ф. Карскага, выдатнага даследчыка беларускай мовы, літаратуры, фальклярыстыкі, заснавальніка беларускай дыялекталогіі, якая была ўстаноўлена летась пастановай Савета Міністраў БССР у гонар 130-годдзя з дня нараджэння Яфіма Федаравіча, — засталася вакантнай. Як ні дзіўна, але на філалагічным факультэце, самым буйным у нашым універсітэце, не знайшлося студэнта, вартага гэтай ганаровай стыпендыі.

## ЗА САЮЗ НЕПАРУШНЫ РЭСПУБЛІК СВАБОДНЫХ

**Дзень 10 сакавіка стаў адметнай вяхой у жыцці працоўных трох мяжуючых абласцей — Бранскай, Гомельскай і Чарнігаўскай з трох рэспублік-сясцёр — РСФСР, Беларусі і Украіны. Іх пасланцы зноў сабраліся на славутай мясціне — ля манумента дружбы. На гэты раз для таго, каб выказаць свае адносіны да прадстаячага рэферэндуму СССР, Сюды, дзе злучаюцца землі трох братніх славянскіх народаў, з'ехаліся сотні аўтобусаў і ў многа разоў больш легкавых аўтамашын. Ціхае сонечнае надвор'е, лёгкі марозчык, узорная арганізацыя свята выклікалі ў яго ўдзельнікаў прыўзняты настрой.**

**Адбыўся мнагалюдны мітынг. На ім выступалі партыйныя і савецкія работнікі, народныя дэпутаты, ветэраны вайны і працы, прадстаўнікі маладога пакалення. Словы ўсіх прамоўцаў былі прасякнуты вялікім клопатам аб заўтрашнім лёсе нашай шматнацыянальнай краіны, якая перажывае цяпер складаны крызісны перыяд. Кожны выступаючы заклікаў у дзень рэферэндуму прадэманстраваць сваё гарачае імкненне да адзінства і згуртавання ў абноўленым Саюзе суверэнных рэспублік, непрымірымасць да тых сіл, якія намераны раз'яднаць нашу краіну.**

**Пасля мітынгу калектывы мастацкай самадзейнасці трох абласцей выступілі з вялікім канцэртам.**

**Прайшоўшае свята засведчыла, што дружба рускага, украінскага і беларускага народаў і надалей застанецца непарушнай.**

## ПРЫСВЕЧАНЫ СВЯТУ ЖАНЧЫН

Пры перапоўненай актавай зале 6 сакавіка ў нашым універсітэце праходзіў вечар, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню. Уступным словам яго адкрыў в. а. рэктара дацэнт М. В. Селькін. Ад імя рэктарата і грамадскіх арганізацый ён цёпла павіншаваў цудоўную палавіну універсітэцкага калектыву са святам, пажадаў выкладчыцам і супрацоўніцам плённай працы, а студэнткам — паспяховай вучобы, а таксама моцнага здароўя, асабістага шчасця, актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці.

На вечары быў паказаны вялікі святочны канцэрт. Са сваімі нумарамі выступілі ўсе творчыя калектывы клуба мастацкай самадзейнасці «Маладосць».

## СУСТРЭЛІСЯ З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ГРУПАЙ

28 лютага перад сваім чарговым пасяджэннем члены Вучонага савета універсітэта сустрэліся з інфармацыйнай групай абласнога аб'яднання прафсаюзаў, якую ўзначальваў яго старшыня В. У. Вялічка. У саставе групы былі таксама старшыня абкома прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі У. Я. Курылаў, прадстаўнікі гарвыканкома і пракуратуры. Ім было зададзена шмат пытанняў, якія датычыліся сацыяльна - эканамічных, жыллёвых і многіх іншых праблем. Некаторыя з іх звязаны з вынікамі чарнобыльскай аварыі. Размова ішла таксама аб неабходнасці павышэння заработнай платы для вучоных і супрацоўнікаў вышэйшай школы, без чаго ў сённяшніх умовах цяжка замацаваць кадры, аб паляпшэнні іх аздараўлення ў час водпускаў, аб гарантыях уладкавання маладых спецыялістаў ва ўмовах рынку пасля заканчэння ВНУ і многім іншым, што з'яўляецца жыццёва-важным і не перастае хваляваць людзей.

На большасць зададзеных пытанняў былі дадзены грунтоўныя адказы.

**Паважаныя калегі!**

**Добра разумеючы ўсю складанасць сённяшняга становішча ў краіне, мы хочам тым не менш прыцягнуць увагу грамадскасці, дзяржаўнага кіраўніцтва да лёсу вышэйшай школы, а ён у многім звязаны са становішчам педагогаў і вучоных.**

**Прадстаўнікоў кафедр, усіх, хто жадае канструктыўна супрацоўнічаць з намі па пытаннях прававой і сацыяльнай абароны выкладчыкаў ВНУ, запрашаем 14 сакавіка ў 14 гадзін у актавую залу універсітэта.**

**ІНІЦЫЯТЫЎНАЯ ГРУПА: А. У. ВАРОНІЧ, Л. Я. ПАЛЯКОЎ, І. П. ТРАЦЭЎСКІ, М. У. ФІЛІМОНЕНКА.**

## ВЫБРАНЫ НА ВАКАНТНЫЯ ПАСАДЫ

28 лютага на пасяджэнні Вучонага савета выбраны на вакантныя пасады дацэнтаў: У. П. Каваленка — кафедра беларускай літаратуры, У. С. Давыдаў — кафедра аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі, А. П. Старавойтаў — кафедра матэматычнага аналізу, В. С. Рабенка — кафедра нямецкай і французскай моў; на пасаду старшага выкладчыка: Р. С. Галіеў — кафедра матэматычных праблем кіравання, У. У. Макарэвіч, Г. Г. Клапоцкая — кафедра тэорыі і методыкі фізічнай культуры, Г. І. Нарскін, В. Д. Падасінаў — кафедра лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, У. П. Астахаў — кафедра фізічнага выхавання.

Па выніках галасавання прадстаўлены ў Дзяржадукацыю СССР для прысваення вучонага звання дацэнт кандыдат эканамічных навук А. У. Вароніч з кафедры палітэканоміі і кандыдат геолага-мінералагічных навук Г. А. Сербін з геалагічнага факультэта.

